*І. М. ЦЭВАН*

# ДЗЕЙНАСЦЬ СУЧАСНЫХ АМАТАРСКІХ МАСТАЦКІХ КАЛЕКТЫВАЎ ФАЛЬКЛОРНАГА КІРУНКУ: ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫ ПАДЫХОД

*Выхаванне падрастаючага пакалення ва ўмовах сацыякультурнай сферы – адна з важнейшых задач педагагічнай тэорыі і практыкі. У артыкуле разглядаецца спецыфіка рэалізацыі выхаваўчай функцыі ў дзейнасці сучасных аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку. Прыводзяцца некаторыя вынікі эмпірычнага даследавання, накіраванага на вывучэнне адносін падлеткаў да адметных рыс нацыянальнага характару беларусаў.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пытанні сутнасці, спецыфікі і класіфікацыі функцый аматарскай мастацкай дзейнасці фальклорнага кірунку маюць істотнае метадалагічнае значэнне.

Функцыянальная прырода аматарскай мастацкай дзейнасці фальклорнага кірунку дваістая. З аднаго боку, яна праяўляецца ў асаблівасцях функцыянавання мастацкіх калектываў у сацыякультурнай сферы і адпавядае спецыфіцы дзейнасці адпаведных сацыякультурных інстытутаў – клубаў, дамоў культуры і народнай творчасці, цэнтраў, палацаў, дзіцячых школ мастацтваў і іншых устаноў. З другога боку, удзельнікі такіх калектываў займаюцца нічым іншым, як мастацкай дзейнасцю, што дае падставу для рэалізацыі менавіта функцый мастацтва.

У тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці пад функцыямі разумеюцца формы грамадскай практыкі, якія вызначаюць прыроду, спецыфіку, задачы, механізмы і сродкі засваення, стварэння і трансляцыі каштоўнасцей культуры. Такое разуменне дазволіла вядучым спецыялістам у вобласці педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці – М. А. Арыярскі [1], Я. Д. Грыгаровіч [3], І. Н. Ерашэнкаў [4], А. Д. Жаркоў [5], Т. Р. Кісялёва і Ю. Д. Красільнікаў [7], І. А. Малахава [8], В. Н. Рабушаў [10], А. В. Сакалоў [12], Я. І. Смірнова [11] і інш. – абгрунтаваць і вылучыць такія функцыі, як адаптацыйная, адукацыйная, выхаваўчая, інфармацыйна-асветніцкая, камунікатыўная, культурааарыентаваная, культураахоўная, культурастваральная, культурапераўтваральная, развіваючая, рэкрэацыйна-аздараўленчая, эстэтычная і інш.

Рэалізацыя ў практычнай дзейнасці тых ці іншых функцый залежыць, у першую чаргу, ад мастацкага кірунку калектыву. Таму нельга пакінуць без увагі і функцыі мастацтва як спецыфічнай сферы праяўлення актыўнасці падрастаючага пакалення ва ўмовах аматарскіх калектываў. Даследаванні Ю. Б. Борава [2], М. С. Кагана [6], Э. У. Сакалова [13], Л. Н. Сталовіча [14], Ю. У. Фохта-Бабушкіна [15] і інш. дазваляюць вылучыць разнастайныя функцыі мастацтва – асветніцкую, ацэначную, выхаваўчую, геданістычную, грамадска-пераўтваральную, інфармацыйную, кампенсатарную, камунікатыўную, мастацка-канцэптуальную, пазнавальную, прагнастычную, сацыялізуючую, эстэтычную і інш.

Такая ўзаемаабумоўленасць разнастайных функцый сацыяльна-культурнай і мастацкай дзейнасці цалкам адпавядае спецыфіцы дзейнасці ама-

тарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку ў сферы культуры і вольнага часу.

*Мэтамі* дадзенага *артыкула* з'яўляюцца выяўленне асаблівасцей рэалізацыі выхаваўчай функцыі ў дзейнасці аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку і вызначэнне адносін падлеткаў да станоўчых і адмоўных рыс нацыянальнага характару беларусаў.

Адной з важных функцый аматарскай мастацкай дзейнасці фальклорнага кірунку ўяўляецца выхаваўчая. У практычнай дзейнасці сучасных аматарскіх фальклорных калектываў (ансамблі і аркестры народных інструментаў, ансамблі і хары з народнай манерай спеваў, вакальна-інструментальныя калектывы) яе рэалізацыя мае свае асаблівасці.

Фарміраванне асобы адбываецца пры выкарыстанні лепшых узораў традыцыйнага фальклору ў апрацаваным або неапрацаваным выглядзе і аўтарскіх фалькларызаваных твораў, якія адлюстроўваюць традыцыйныя духоўныя каштоўнасці беларускага грамадства. Фарміруецца сістэма жыццёвых установак, арыенціраў, ідэалаў, сэнсаў, якія выражаюць адносіны чалавека да матэрыяльнага і духоўнага жыцця грамадства і ўключаюць прыметы, якія падкрэсліваюць культурную адметнасць беларускага этнасу (мова, народнае мастацтва, традыцыі, абрады, звычаі).

Адбываецца ўсведамленне асобай народнага ідэалу, сфарміраванага пад уздзеяннем гістарычных умоў жыцця і адлюстраванага ў комплексе такіх станоўчых рыс нацыянальнага характару беларусаў, як добрасумленнасць, шчодрасць, гасціннасць, няпомслівасць, лагоднасць, памяркоўнасць, цярпімасць, талерантнасць і інш.

Адной з асаблівасцей выхаваўчага працэсу з'яўляецца мэтанакіраваная арыентацыя асобы на маральны ідэал (ідэал дасканалага чалавека), які ўключае сукупнасць маральных патрабаванняў да чалавека, правілы і нормы паводзін, сканцэнтраваныя ў розных відах вуснай народнай творчасці – пераважна ў прыказках, прымаўках, казках і песнях. Асноўнымі крытэрыямі маральнай ацэнкі з'яўляюцца адносіны чалавека да працы, сям'і, бацькаўшчыны, а таксама яго найважнейшыя маральныя якасці – патрыятызм, працавітасць, сумленнасць, гуманізм, чалавечнасць, чэснасць, праўдзівасць, паважлівыя адносіны да людзей, дабрыня, таварыскасць, гонар, годнасць. У паняцце ідэалу чалавека беларускі народ таксама ўкладвае разумовае і фізічнае развіццё, якое мае сэнс толькі ў спалучэнні са станоўчымі маральнымі якасцямі асобы.

Важнае значэнне набывае мэтанакіраванае і сістэматычнае фарміраванне музычнай культуры, музычных здольнасцей чалавека, выхаванне эмацыянальнай чуласці да фальклору і разуменне, глыбокае перажыванне яго зместу. Выхаваўчыя магчымасці народных і аўтарскіх музычна-паэтычных тэкстаў мастацкіх твораў рэалізуюцца праз назіранне і перажыванне разнастайных выхаваўчых сітуацый удзельнікамі калектыву (адначасова стваральнікамі, выканаўцамі, слухачамі і крытыкамі). У тэкстах мастацкіх твораў узнімаюцца этычныя праблемы дабра і зла, справядлівага і несправядлівага, праўды і хлусні, сумленных і дрэнных учынкаў, асуджаюцца бяздзейнасць, дармаедства, няўмельства, балбатлівасць, плёткі, самахвальства, фанабэрыстасць, зазнайства і іншыя адмоўныя рысы характару.

У працэсе ўдзелу ў аматарскай мастацкай дзейнасці фальклорнага кірунку адбываецца этнічная самарэалізацыя асобы праз сутыкненне з элементамі беларускай традыцыйнай народнай творчасці, якая ў сваю чаргу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварае ядро нацыянальнай культуры і з'яўляецца гарантам яе этнічнай своеасаблівасці.

Менавіта ў аматарскіх мастацкіх калектывах, як найбольш распаўсюджаных і набліжаных у сучасных умовах да традыцыйнай мастацкай культуры, павінна, на нашу думку, адбывацца выхаванне падрастаючага пакалення сродкамі арганізаванай этнаарыентаванай сацыякультурнай дзейнасці. Выхаваўчы патэнцыял такіх калектываў абумоўлены наступнымі характарыстыкамі іх дзейнасці.

Па-першае, арыентацыя на народны пласт культуры звязана з выкарыстаннем лепшых узораў фальклору, у рэпертуары мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку яны складаюць большую частку.

Па-другое, адметнай характарыстыкай дзейнасці такіх калектываў з'яўляецца выкананне мастацкіх твораў у народнай манеры. У спевах выкарыстоўваецца натуральнае, адкрытае, «блізкае», размоўнае гучанне, грудное рэзаніраванне ў паслямутацыйны і галаўное, «сярэбранае» ў дамутацыйны перыяд, ужываецца як літаратурная беларуская мова, так і рэгіянальныя гаворкі. У час ігры на традыцыйных і акадэмічных беларускіх народных інструментах выкарыстоўваюцца спецыфічныя, уласцівыя беларускай народнай культуры прыёмы гуказдабывання, штрыхавой тэхнікі, інтанацыйна-тэмбравых стэрэатыпаў. Гэта ігра на некаторых інструментах з нізкім, сярэднім і высокім тэмперыраваным строем; выкарыстанне гармоніка з эфектам разліву; глушэнне струн на цымбалах і выкарыстанне палачак як з абшыўкай, так і без яе; ужыванне пустых, адкрытых струн і эфекту саслізгвання на скрыпцы; выкананне твораў на скрыпцы і дудзе з актаўным і квінтавым бурдонам, а таксама з разнастайнай арнаментальнай фактурай – трэлямі, мардэнтамі, фаршлагамі, групэта і інш.

Нарэшце, спецыфічным з'яўляецца выкарыстанне ў рабоце калектыву пэўнай народнай атрыбутыкі. Гэта рэканструяваныя або стылізаваныя касцюмы, вышываныя вырабы, прадметы народнага побыту і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – рэчы з саломы, лазы, гліны, ганчарныя вырабы і інш.

Усе абазначаныя характарыстыкі дзейнасці аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку разглядаюцца намі як кампаненты этнаарыентаванай сацыякультурнай дзейнасці. Акрамя гэтага, мы разглядаем дадзеныя асаблівасці як крытэрыі аднясення мастацкіх калектываў менавіта да фальклорнага кірунку.

Найбольш спрыяльным для выхавання на этнакультурных традыцыях беларусаў з'яўляецца падлеткавы ўзрост, падчас якога магчымы фарміраванне сістэмы жыццёвых установак на маральна-этычны ідэал дасканалага чалавека і этнічная самарэалізацыя сродкамі мастацкай дзейнасці фальклорнага кірунку. Паводле Ж. Піажэ, менавіта ў падлеткавым узросце этнічная ідэнтычнасць фарміруецца найбольш актыўна, дзіця становіцца здольным усвядоміць адметнасць і ўнікальнасць гісторыі, спецыфіку традыцыйнай побытавай культуры [9].

Важным для нашага даследавання з'яўляецца магчымасць усведамлення падлеткамі – удзельнікамі мастацкіх калектываў – рыс нацыянальнага характару беларусаў, так як менавіта ў ім пераплятаюцца элементы свядомасці, ідэалогіі, маральнай культуры, паводзін і грамадскай псіхікі людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разуменне феномена нацыянальнага характару як «гістарычна ўтворанай сукупнасці ўстойлівых псіхалагічных рыс нацыі, якая вызначае манеру паводзін і тыповы лад жыцця людзей, іх адносіны да працы, іншых народаў, да сваёй культуры» дазваляе нам выказаць думку аб спрыяльнасці выхаваўчага асяроддзя мастацкага калектыву фальклорнага кірунку для далучэння падрастаючага пакалення да традыцыйнай беларускай культуры, усведамлення яе нацыянальнай адметнасці, разумення станоўчых рыс нацыянальнага характару і арыентацыі на маральны ідэал і этычныя, эстэтычныя характарыстыкі паводзін чалавека [16, с. 190].

Для пацвярджэння або абвяржэння абазначанай думкі і высвятлення пытання, ці маецца істотная розніца ў меркаваннях падлеткаў, якія з'яўляюцца або не з'яўляюцца ўдзельнікамі аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку, намі было праведзена анкетаванне. Апытаны падлеткі (160 чалавек) ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў – удзельнікі 14 лепшых мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку г. Мінска і Мінскай вобласці (1 заслужаны і 13 узорных).

Абраныя калектывы адпавядаюць усім вышэйназваным крытэрыям адбору, і іх выхаваўчыя магчымасці абумоўлены названымі характарыстыкамі дзейнасці. Сярод калектываў прадстаўлены:

– фальклорныя ансамблі «Дударыкі» ДУА «Гімназія № 14 г. Мінска», «Жарт» ДУА «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Светач"» Савецкага раёна г. Мінска;

– ансамблі народнай песні і музыкі «Каласкі» ДУА «Наваколасаўская дзіцячая школа мастацтваў Стаўбцоўскага раёна», «Бараўлянская крынічка» ДУА «Бараўлянская дзіцячая школа мастацтваў Мінскага раёна»;

– ансамблі народнай песні «Жавароначкі» ДУА «Стаўбцоўская школа мастацтваў», «Вянок» ДУА «Сярэдняя школа № 115 г. Мінска», «Кветкі» ДУА «Сярэдняя школа № 71 г. Мінска», «Дзянніца» ДУА «Клецкая школа мастацтваў», «Марачаначка» Морацкага сельскага дома культуры Клецкага раёна;

– ансамблі народнай музыкі «Самагуды» ДУА «Маладзечанская дзіцячая школа мастацтваў», ансамбль Вязынскага цэнтра культуры і вольнага часу Вілейскага раёна;

– цымбальныя ансамблі і аркестры – аркестр «Першацвет» ДУА «Сярэдняя школа № 13 г. Мінска», аркестр ДУА «Дзяржынская дзіцячая школа мастацтваў», ансамбль цымбалістаў «Васількі» ДУА «Гімназія № 10 г. Мінска».

Для параўнання атрыманых дадзеных былі апытаны падлеткі (160 чалавек), якія не наведваюць мастацкія калектывы, – школьнікі 6–9 класаў трох агульнаадукацыйных школ (ДУА г. Мінска № 63, 191, 196), таксама ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў.

Апытанне, праведзенае сярод удзельнікаў названых мастацкіх калектываў, паказала, што, у асноўным, у падлеткаў сфарміраваны станоўчыя адносіны да беларускага народа як носьбіта пэўных рыс характару, якія адрозніваюць яго ад іншых народаў свету. Большасць апытаных падлеткаў (68%) адказалі, што беларускі народ мае асаблівыя станоўчыя рысы. Сярод найбольш папулярных адказаў былі дабрыня, гасціннасць, працавітасць, адкрытасць, вернасць радзіме, ветлівасць, дабрадушнасць, любоў да прыроды і радзімы, міласэрнасць, мужнасць, павага адзін да аднаго, па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мяркоўнасць, сціпласць, спагадлівасць, сяброўства, талерантнасць, шчодрасць, шчырасць.

Паказальна, што толькі 2% падлеткаў адзначылі наяўнасць адмоўных рыс беларускага народа, да каторых аднеслі памяркоўнасць і «пачуццё натоўпу». Адказ аб тым, што беларускі народ не мае ніякіх асаблівых рыс, якія адрозніваюць яго ад іншых народаў, выбралі толькі 4% падлеткаў.

Неабходна адзначыць, што дастаткова вялікая колькасць (26%) падлеткаў – удзельнікаў мастацкіх калектываў увогуле не змаглі адказаць на пастаўленае пытанне.

Вынікі апытання школьнікаў, якія не наведваюць мастацкія калектывы, акрэсліліся некалькі па-іншаму. На наяўнасць станоўчых рыс беларускага народа ўказвалі 34%: з іх 11% назвалі такія рысы, як гасціннасць, 6% – дабрыня, 3% – працавітасць, астатнія 14% дзяцей давалі самыя разнастайныя станоўчыя адказы – адкрытасць, ветлівасць, дабрадушнасць, гатоўнасць дапамагчы бліжняму, дысцыплінаванасць, любоў да працы, патрыятызм, справядлівасць, шчодрасць, шчырасць.

На наяўнасць адмоўных рыс (без удакладнення) указвалі 4% дзяцей.

Яшчэ 14% дзяцей адказалі, што беларусы не маюць ніякіх асаблівых рыс, якія адрозніваюць іх ад іншых народаў.

Большая частка падлеткаў (48%) не змаглі адказаць на пытанне «Ці мае, на тваю думку, беларускі народ нейкія рысы, якія адрозніваюць яго ад іншых народаў?».

Вынікі параўнання адказаў падлеткаў, якія наведваюць і не наведваюць мастацкія калектывы, можна прадставіць наступным чынам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Вызначэнне падлеткамі адметных рыс беларускага народа, % (выбарка 320 чалавек)**

| Адказы | Група 1<br>З'яўляюцца ўдзельнікамі аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку (160 чалавек) | Група 2<br>Не з'яўляюцца ўдзельнікамі аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку (160 чалавек) |
|---|---|---|
| Беларусы маюць адметныя станоўчыя рысы | 68 | 34 |
| Беларусы маюць адметныя адмоўныя рысы | 2 | 4 |
| Беларусы не маюць ніякіх адметных рыс | 4 | 14 |
| Адсутнасць адказу | 26 | 48 |

З прадстаўленай табліцы бачна, што ўсвядомленасць у дачыненні да адметных рыс беларускага народа як станоўчых, так і адмоўных, у падлеткаў прадстаўленых дзвюх груп значна адрозніваецца. Так, назваць станоўчыя рысы беларускага народа змаглі 68% і 34% падлеткаў адпаведна ў групах, увогуле не змаглі адказаць на пытанне 26% і 48%. Даволі вялікая колькасць падлеткаў з ліку тых, хто не наведвае заняткі ў аматарскіх мастацкіх калектывах фальклорнага кірунку (14%), адказалі, што беларусы не маюць ніякіх адметных рыс, якія б адрознівалі іх ад іншых народаў.

Аналізуючы адказы, можна зрабіць выснову, што 68% падлеткаў 1-й групы і 34% 2-й групы ў стане назваць станоўчыя рысы беларускага народа; 32% і 66% адпаведна або не могуць вызначыць свае адносіны і не адказваюць на пытанне анкеты, або называюць адмоўныя рысы беларусаў, або ўвогуле не вызначаюць беларускі народ як адметны сярод іншых. Такія станоўчыя рысы характару беларусаў, як дабрыня, гасціннасць і працавітасць найбольш часта сустракаліся ў адказах падлеткаў.

Такім чынам, аналіз адказаў падлеткаў дазваляе гаварыць аб спрыяльнасці выхаваўчага асяроддзя аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку, спецыфіку дзейнасці якіх складаюць выкарыстанне лепшых узораў музычнага фальклору, пэўнай народнай атрыбутыкі, выкананне ў народнай манеры. Аб гэтым сведчыць сфарміраванасць у падлеткаў – удзельнікаў мастацкіх калектываў фальклорнага кірунку – свядомых адносін да станоўчых рыс нацыянальнага характару беларусаў, іх арыентацыя на культурную самабытнасць беларускага народа.

1. *Ариарский, М. А.* Прикладная культурология / М. А. Ариарский. – СПбГУКИ, Ассоц. музеев России. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : Эго, 2001. – 287 с.

2. *Борев, Ю. Б.* Эстетика : в 2 т. / Ю. Б. Борев. – 5-е изд., доп. – Смоленск : Русич, 1997. – Т. 1. – 576 с.

3. *Грыгаровіч, Я. Д.* Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта : педагагічны аспект / Я. Д. Грыгаровіч ; Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2002. – 403 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Ерошенков, И. Н.* Культурно-воспитательная деятельность среди детей и подростков : учеб. пособие / И. Н. Ерошенков. – М. : Гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 2004. – 221 с.

5. *Жарков, А. Д.* Технология культурно-досуговой деятельности : учеб. пособие / А. Д. Жарков. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Изд-во МГУК : Профиздат, 2002. – 288 с.

6. *Каган, М.С.* Лекции по марксистско-ленинской эстетике / М. С. Каган. – 2-е изд., расшир. и перераб. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1971.– 766 с.

7. *Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 531 с.

8. *Малахова, И. А.* Развитие креативности школьников в процессе любительской художественной деятельности : дис. … д-ра пед. наук: 13.00.05 / И. А. Малахова. – Минск, 2011. – 319 с.

9. *Пиаже, Ж.* Речь и мышление ребенка / Ж. Пиаже. – М. : Педагогика-Пресс, 1994. – 526 с.

10. *Рябушев, В. Н.* Теория социально-культурной деятельности : учеб. пособие / В. Н. Рябушев. – Улан-Удэ : ИПК ВСГАКИ, 1999. – 172 с.

11. *Смирнова, Е. И.* Художественная самодеятельность как социально-педагогическое явление : дис. … д-ра пед. наук: 13.00.05 / Е. И. Смирнова. – Л., 1989. – 488 с.

12. *Соколов, А. В.* Феномен социально-культурной деятельности / А. В. Соколов. – СПб. : СПбГУП, 2003. – 204 с.

13. *Соколов, Э. В.* Культурология : очерки теории культуры / Э. В. Соколов. – М. : Интерпакс, 1994. – 272 с.

14. *Столович, Л. Н.* Красота, добро, истина : очерк истории эстетической психологии / Л. Н. Столович. – М. : Республика, 1994. – 464 с.

15. *Фохт-Бабушкин, Ю. У.* Искусство и духовный мир человека : об особенностях воздействия искусства на личность / Ю. У. Фохт-Бабушкин. – М. : Знание, 1982. – 110 с.

16. Этнопсихологический словарь / Акад. пед. и соц. наук, Моск. психол.-соц. ин-т ; под ред. В. Г. Крысько. – М., 1999. – 343 с.

*I. TSEVAN*

## MODERN AMATEUR FOLKLORE GROUP ACTIVITY: FUNCTIONAL APPROACH

*Children education in the social culture sphere is one of the most important aims in the theory and practice of contemporary pedagogics. The article deals with educational possibilities in the social- cultural activity of modern amateur folklore groups. Some results of empirical study aimed at investigating teenagers' attitude to the positive and negative features of the Belarusian national character are given in the article.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 28.05.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ